ISSN 1024-5928 (print)

## *ГІСТОРЫЯ*

HISTORY

УДК 904:737.1(37)(476.5)

Паступіў у рэдакцыю 15.08.2017
Received 15.08.2017

**В. М. Ляўко[1], В. М. Сідаровіч[2]**

*[1]Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск, Беларусь*
*[2]Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*

# РЫМСКІЯ МАНЕТЫ З ГАРАДЗІШЧА І СЕЛІШЧА КАЛЯ В. КАРДОН У БЕЛАРУСКІМ ПАДЗВІННІ

**Аннотация.** Рассмотрены античные монеты, найденные во время исследования археологического комплекса Кордон Шумилинского района Витебской области. На широкой фактологической основе с территории Белорусского Подвинья прослежено весьма редкое явление – первые две находки античных монет в восточной его части (Витебский регион), полученные путем раскопок сотрудниками Института истории НАН Беларуси в 2016 г. Это денарий Марка Аврелия (164 г. н.э.) – с городища и дидрахма Веспасиана и Тита (69–79 гг. н.э.) – из селища 1. Авторы высказали предположение о возможных путях и обстоятельствах попадания этих артефактов на археологический памятник Кордон. Более вероятным они считают появление римских монет на правобережье Витебского Подвинья через носителей киевской культуры из днепровско-двинского междуречья. Это предположение обосновывается и находками артефактов, связанных с данной культурой как в Кордоне, так и в рассматриваемом регионе в целом. Датировка нижних пластов городища и селища 1 в Кордоне по наличию керамики с т.н. “расчёсами” свидетельствует в пользу попадания монет на памятник в период самого раннего времени его существования.

**Ключевые слова:** римские монеты, археологический памятник, Белорусское Подвинье, городище, селище, торговые пути, Римская империя, железный век, Барбарикум, киевская культура

**Для цитирования:** Ляўко, В. М. Рымскія манеты з гарадзішча і селішча каля в. Кардон у Беларускім Падзвінні / В. М. Ляўко, В. М. Сідаровіч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2017. – № 4. – С. 43–49.

**V. M. Liauko[1], V. M. Sidarovich[2]**

*[1]Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*
*[2]Belarusian State University, Minsk, Belarus*

## ROMAN COINS FROM THE HILL FORT AND SETTLEMENT NEAR KARDON IN THE BELARUSIAN DZVINA REGION

**Abstract.** The article presents antique coins which were discovered during the excavations of the archeological complex of Kardon in Shumilina district, Vitebsk region. According to the wide factual basis, a very rare phenomenon had been traced in the territory of the Belarusian Dzvina region: ancient coins were found in its eastern part (Vitebsk region) through official excavations by the Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus in 2016. These are a denarius of Marcus Aurelius (AD 164) from the hill fort and a didrachm of Vespasian and Titus (AD 69 to 79) from settlement 1. The authors expressed their ideas on possible ways and circumstances for these artifacts to have appeared on the archaeological site of Kardon. They believe that the Roman coins most probably got on the right side of the Vitebsk Dzvina region through representatives of the Kiev culture from the area between the Dnieper and Dzvina rivers. This opinion is substantiated by artifacts related to this culture that were found both in Kardon and in the considered region. The dating of the lower cultural layers of the hill fort and settlement 1 in Kardon is made on the basis of the availability of comb-marked pottery, and it is possible that the coins got on the site in the earliest period of its existence.

**Keywords:** Roman coins, archaeological site, Belarusian Dzvina region, hill fort, settlement, trade routes

**For citation:** Liauko V. M., Sidarovich V. M. Roman Coins from the Hill Fort and Settlement near Kardon in the Belarusian Dzvina Region. *Vestsi Natsyianal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian series,* 2017, no 4, pp. 43–49 (in Belarusian).

© Ляўко В. М., Сідаровіч В. М., 2017

**Уводзіны.** Падчас даследаванняў пад кіраўніцтвам В. М. Ляўко комплексу помнікаў каля вёсак Кардон і Ілава Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці быў атрыманы багаты нумізматычны матэрыял, які прадстаўлены пераважна манетамі VIII–X стст. Аднак самымі раннімі нумізматычнымі знаходкамі з раскопак на гарадзішчы і селішчы каля в. Кардон з’явіліся надзвычай рэдкія для Віцебска-Полацкага Падзвіння антычныя манеты.

Беларускае Падзвінне менш за іншыя рэгіёны нашай краіны насычана знаходкамі антычных манет. У адрозненне ад тэрыторыі Паўднёва-Заходняй Беларусі, заселенай у II–IV стст. носьбітамі вельбарскай культуры, якія мелі актыўныя кантакты з Рымскай імперыяй і былі добра знаёмыя з рымскім манетным срэбрам, у басейне сярэдняй і верхняй Дзвіны антычныя манеты сустракаюцца вельмі рэдка. У гэтым рэгіёне падобныя знаходкі сканцэнтраваны пераважна на захадзе Віцебскай вобласці. Так, на гарадзішчы Пруднікі (цяпер Міёрскі раён) быў знойдзены дэнарый Адрыяна [1, 1957, s. 281], а непадалёк ад гэтага помніка, на беразе Дзвіны каля в. Вята, мясцовы пастушок зрабіў незвычайную знаходку – дзве залатыя манеты, перарobленыя на падвескі, – аўрэус Карына і солід Валента [2, 1931, s. 90–93]. У міжваенныя гады каля мястэчка Друя (цяпер Браслаўскі раён) быў знойдзены дэнарый Даміцыяна чаканкі 84 г., які захоўваецца цяпер у фондах Археалагічна-этнаграфічнага музея ў Лодзі [3, 1954, s. 41]. У 1982 г. міёрскі краязнаўца В. Ермалёнак знайшоў паміж вёскамі Туркова і Ракуны Міёрскага раёна дробную медную манету Максіміяна Геркулія (285–305), адчаканеную ў г. Кізік паміж 295 і 299 гг. [4, 1996, с. 123; 5, 2008а, с. 11]. У 2005 г. на гародзе І. С. Сівіцкай у в. Мышкі Пастаўскага раёна быў выпадкова знойдзены бронзавы сестэрцый Люцыллы (163–181) [6, 2008б, с. 173–174], адчаканены прыкладна ў 164–170 гг. За апошняе дзесяцігоддзе шэраг знаходак манет Рымскай імперыі на захадзе Віцебшчыны (пераважна на Глыбоччыне) быў здзейснены скарбашукальнікамі. Сярод іх дэнарый Люцыя Вера, буйныя бронзавыя наміналы (пераважна сестэрцыі) Марка Аўрэлія, Люцыя Вера, Фаусціны Малодшай, Каммода, Аляксандра Сэвера, Атацыліі Сэверы, Філіпа I, а таксама тры правінцыяльна-рымскія манеты, сярод якіх манета Філіпа II, адчаканеная ў г. Томы [7, 2014, p. 79], і манета Макрына, адчаканеная ў Нікеі.

**Асноўная частка.** Што тычыцца ўсходу Віцебшчыны, то надзейных сведчанняў пра знаходкі тут рымскіх манет да апошняга часу не было. Л. Д. Победь узгадваў пра рымскія манеты, якія быццам былі знойдзены каля Стражавічаў Чашніцкага раёна да 1900 г. [4, 1996, с. 117], спасылаючыся на сведчанне Е. Р. Раманава аб гэтым у «Могилевской старине» [8, 1900, с. 5]. Але дадзеная інфармацыя, як і інфармацыя пра знаходку скарбу рымскіх манет у ваколіцах г. Дзісна [9, 1983, с. 162, п. 391], не пацверджана.

На тэрыторыі Віцебска-Полацкага Падзвіння да даследаванняў 2016 г. каля в. Кардон антычныя манеты былі вядомыя толькі са знаходак чорных капальнікаў. Гэта чатыры манеты з Полацкага раёна. Так, у 2011 г. на беразе возера Доўгае знойдзены сестэрцый Адрыяна чаканкі 134–138 гг., а на беразе возера Гомель – дэнарый Аляксандра Сэвера (чаканены ў Рыме ў 222–228 гг.)[1]. У 2012 г. непадалёк ад в. Раштова, амаль насупраць вусця ракі Ушача, знойдзены пасмяротны сестэрцый Марка Аўрэлія (адчаканены ўжо ягоным сынам – Каммодам)[2]. Каля в. Струнне знойдзена вельмі цікавая манета – адна з нешматлікіх у Беларусі імітацый рымскага дэнарыя[3].

На падставе пералічанага вышэй тым больш значнай з’яўляецца першая ў Беларускім Падзвінні афіцыйная (пры раскопках археалагічнага помніка) знаходка манет Рымскай імперыі. Адна з манет, дэнарый Марка Аўрэлія, была выяўлена на гарадзішчы Кардон, у самым нізе культурнага слоя, практычна на ўзроўні мацерыка (мал. 1, *5*). Падобныя дэнарыі з’яўляюцца аднымі з самых распаўсюджаных знаходак у еўрапейскім Барбарыкуме.

*Рымская імперыя. Дэнарый. Марк Аўрэлій (138–161 гг.). Рым, снежань 163 г. – снежань 164 г. Аверс: M ANTONINVS AVG IMP II. Галава Марка Аўрэлія ў лаўровым вянку, управа. Рэверс: TR P XVIII COS III. Феліцытас сядзіць на курульным крэсле, управа. Трымае кадуцэй і рог дастатку. RIC III, 112. 2,51 г. Кардон-16, гарадзішча. Мацярык, № 53.*

---

[1] RIC IV, 155.

[2] RIC III, 657[commodus].

[3] Манета з’яўляецца так званай гібрыднай імітацыяй. Аверс манеты імітуе, хутчэй за ўсё, дэнарый Люцыя Вера, а на рэверсе маецца імітацыя выявы багіні, хутчэй за ўсё, Венеры, якая характэрна для манет жонак імператараў (Вучэбная лабараторыя музейнай справы гістарычнага факультэта БДУ. Акт прыёму № 40 ад 18 кастрычніка 2010 г.).

Значна большую цікавасць выклікае другая антычная манета, якая была выяўлена на селішчы Кардон (мал. 1, *6*). Яна належыць да так званай правінцыяльна-рымскай чаканкі. Манета вельмі моцна зацёртая, што выклікала цяжкасці з яе атрыбуцыяй, але дзякуючы дапамозе калег з шэрагу еўрапейскіх універсітэтаў[4] было вызначана, што яна была адчаканена ў г. Кесарыя-Еўсэбія ў правінцыі Кападокія ў час праўлення імператара Веспасіяна. Чаканка яе адбывалася ад імя Веспасіяна і ягонага сына Ціта, які меў тытул цэзара. Узнікла пытанне і з наміналам манеты. Найбольш распаўсюджаным срэбраным наміналам сярод эмісій усходніх правінцый Рымскай імперыі з’яўляецца драхма вагою каля 2,5–3,5 г, але вага кардонскай знаходкі відавочна большая. З гэтай нагоды мы можам меркаваць, што дадзеная манета мае больш рэдкі намінал – дзідрахма, або двайная драхма.

*Рымская імперыя. Кападокія. Дзідрахма(?). Веспасіян (69–79 гг.) і Ціт (як цэзар). Кесарыя-Еўсэбія, 69–79 гг. Аверс: галава Веспасіяна ў лаўровым вянку, управа. Рэверс: галава Ціта ў лаўровым вянку, управа. RPC II, № 1650(?). 4,76 г. Кардон-16. Селішча. Раскоп 1. Кв. 20, пл. 2, № 28.*

Знаходкі манет правінцый Рымскай імперыі не з’яўляюцца чымсьці незвычайным для Беларусі. Гэтыя манеты не вельмі шматлікія – іх зафіксавана крыху больш за 40 экзэмпляраў, але яны прысутнічаюць ва ўсіх рэгіёнах Беларусі [7, 2014, p. 75–83]. У той жа час абсалютная большасць правінцыяльна-рымскіх манет з Беларусі – медныя наміналы. Кападакійская драхма з селішча Кардон – гэта толькі другая, пасля лікійскай драхмы з Лышчыцкага скарба [7, 2014, p. 78], знаходка срэбранай правінцыяльна-рымскай манеты і першая манета правінцыі Кападокія на беларускай зямлі.



Мал. 1 . Вырабы з гліны (*1–3*), косці (*4*) і рымскія манеты (*5, 6*) з гарадзішча і селішча 1 каля вёскі Кардон

Fig. 1. Clay artifacts (*1–3*), bone item (*4*) and Roman coins (*5, 6*) from the hill fort and settlement near Kardon

Увогуле, кападакійскія манеты вельмі рэдка сустракаюцца ў сумежных з Беларуссю рэгіёнах. Так, на тэрыторыі Польшчы вядомыя толькі дзве такія знаходкі. Абедзве яны паходзяць з Малапольшчы: драхма Траяна маецца ў складзе вялікага скарбу *Nietulisko Małe I* [10, 2004], а буйная бронзавая манета Каракаллы знойдзена на паселішчы эпохі рымскіх уплываў *Jakuszowice* [11, 1997, p. 122, № 98]. Медная манета Аляксандра Сэвера выяўлена на Харкаўшчыне [12, 2012, с. 156, п. 36].

Срэбраныя манеты ўсходніх правінцый, у першую чаргу драхмы, удзельнічалі ў грашовым абарачэнні еўрапейскай часткі Рымскай імперыі разам з дэнарыямі цэнтральнай чаканкі [13, 1979], таму іх прысутнасць у Барбарыкуме цалкам зразумелая. У той жа час украінскі даследчык К. Мызгін мяркуе, што наяўнасць срэбраных малаазійскіх наміналаў у скарбах рымскіх дэнарыяў можа сведчыць пра тое, што гэтыя дэпазіты сфарміраваліся з вайсковай здабычы варвараў, якія ў III ст. н.э. неаднаразова рабавалі правінцыі Малой Азіі [14, 2011, с. 322–323].

Знаходка манет Рымскай імперыі на комплексе археалагічных помнікаў каля в. Кардон дазваляе ўзняць пытанне аб тым, калі і якім шляхам гэтыя манеты трапілі ў Полацка-Віцебскае Падзвінне, а таксама з якімі групамі насельніцтва звязана гэтае паступленне. Пачатак масавага прытоку рымскіх манет у канцы II ст. н.э. на тэрыторыю Беларусі варта звязваць з экспансіяй вельбарскай культуры. Аднак гэта тычыцца пераважна Пабужжа і Заходняга Палесся, а таксама, магчыма, часткі Панямоння. Яшчэ адным кірункам пранікнення на тэрыторыю Беларусі эмісій Рымскай імперыі, магчыма, з’яўляецца нёманскі (паўночна-заходні). Гэты кірунак звязаны, верагодна, з міграцыяй у Беларускае Панямонне ў III–IV стст. (а магчыма, і раней) значных груп балцкага

[4] За дапамогу ў вызначэнні манеты выказваем шчырую падзяку доктару Жэрому Майрату (Оксфардскі ўніверсітэт), Томашу Венцэку (Варшаўскі ўніверсітэт) і к.г.н. Кірылу Мызгіну (Варшаўскі ўніверсітэт – Харкаўскі ўніверсітэт).

насельніцтва з Ніжняга Панямоння і суседніх рэгіёнаў Польшчы – Мазурыі і Сувалкіі [15, 1996, с. 16–18]. Менавіта з гэтым кірункам можна атаясамліваць знаходкі з паўднёвага захаду Віцебшчыны (у першую чаргу Глыбоччыны). У той жа час месцазнаходжанні рымскіх манет з Міёршчыны і Браслаўшчыны можна звязваць з існаваннем марскога гандлёвага шляху, які злучаў парты паўднёвага ўзбярэжжа Паўночнага мора з вусцем Віслы, а таксама, верагодна, з вусцямі Нёмана і Заходняй Дзвіны. На думку М. Міхельбертаса, гэты шлях найбольш інтэнсіўна выкарыстоўваўся ў другой палове III–IV ст. [16, 1965, с. 15]. Да версіі аб падаўжэнні рымскіх марскіх гандлёвых камунікацый да паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа Балтыйскага мора далучаецца В. Качановіч, які дапускае магчымасць паступлення гэтым шляхам манет Каўнаскага скарбу, сярод якіх прысутнічае чаканка гальскіх узурпатараў Віктарына, Тэтрыка I і Тэтрыка II, а таксама брытанскага ўзурпатара Алекта [17, 2001, s. 137–140]. Наяўнасць марскіх кантактаў паміж імперыяй і паўднёва-ўсходняй Прыбалтыкай пераканаўча абгрунтоўвае А. Буршэ, які лічыць, што яны існавалі з 270-х гг. н.э. [18, 1983, s. 70].

Наяўнасць актыўных сувязяў Ніжняга Падзвіння з Рымскай імперыяй пацвярджаецца значнай колькасцю манетных знаходак у Латвіі, пераважна на тэрыторыях, што непасрэдна прылягаюць да Дзвіны (Даўгавы). Гэта не толькі асобныя манеты, але і скарбы, напрыклад з Дандале і Даўгаўпілса [19, с. 101–102, № 1470, 1471]. Да гэтых знаходак прымыкаюць і манеты з паўночнага захаду Віцебшчыны, частка з якіх датуецца другой паловай III–IV ст. – часам актыўнага функцыянавання згаданага вышэй марскога шляху.

У той жа час крыніцай паступлення рымскага імпарту ў Падзвінне паміж Полацкам і Віцебскам маглі быць так званыя “ўсходнія шляхі”. Галоўны з іх, паводле М. Міхельбертаса, ішоў па Дняпры і меў адгалінаванні на Дзвіну і Нёман. Выказваючы гэтае меркаванне, літоўскі даследчык засноўваўся на беларускіх і латышскіх знаходках. Сапраўды, на карысць гэтай версіі сведчыць шэраг знаходак, напрыклад, імпартныя ўсходнія пацеркі ў пахаваннях IV–V стст. ва Усходняй Літве [20, 1965, с. 16], што вельмі важна для нас у святле разглядаемага пытання аб паступленні манет усходніх правінцый Рымскай імперыі як у Літву [20, 1968; 21, 2010], так і ў Беларусь [7, 2014, p. 75–83].

Варта падкрэсліць, што каля паловы беларускіх знаходак такіх манет лакалізуецца ў Падняпроўі, у арэале кіеўскай культуры [7, 2014, p. 79]. Менавіта з гэтай культурай можна звязваць распаўсюджванне на ўсходзе Беларусі рымскіх манет – як эмісій цэнтральных, так і правінцыяльных манетных двароў. У сваю чаргу ў арэал кіеўскай культуры манеты траплялі ад носьбітаў чарняхоўскай культуры, якія былі вельмі добра знаёмыя з гэтымі атрыбутамі антычнай цывілізацыі. Больш за тое, у рэгіёнах, якія непасрэдна прылягалі да рымскага лімеса, у “чарняхоўцаў” назіраецца нараджэнне грашовага абарачэння [22, 2008, с. 75–76].




Мал. 2. Фрагменты ляпной керамікі з арнаментам у выглядзе “расчосаў” з гарадзішча і селішча Кардон

Fig. 2. Fragments of hand-made pottery with comb-marked ornamentation from the hill fort and settlement near Kardon

Да пэўнага часу Падзвінне не адносілі да арэала кіеўскай культуры, але даследаванні апошніх дзесяцігоддзяў, у т.л. беларускіх археолагаў [23, 2016, с. 277–280; 24, 2016, с.250; 25, 2016, с. 255–262], дазваляюць сцвярджаць аб тым, што гэты арэал можа быць значна пашыраны ў розных кірунках, у т.л. і на значную частку басейна Дзвіны. Менавіта на селішчы ў г.п. Гарадку, а таксама на гарадзішчы Новае Сяло Сенненскага раёна Віцебскай вобласці былі знойдзены не толькі характэрная для кіеўскай культуры кераміка з арнаментам у выглядзе “расчосаў”, але і чарняхоўскія пацеркі. Ніжнія напластаванні археалагічнага комплексу Кардон таксама змяшчаюць кавалкі ляпнога посуду з арнаментам у выглядзе “расчосаў” (мал. 2) і некаторыя рэчы, якія могуць быць датаваны не пазней за V ст. (мал. 1, *1–4*). Такім чынам, можна меркаваць, што распаўсюджанне рымскіх манет у Полацка-Віцебскім Падзвінні звязана

з пранікненнем сюды ў III–IV стст. груп насельніцтва кіеўскай культуры, якое праз пасрэдніцтва чарняхоўскай культуры было знаёмае з гэтай катэгорыяй рымскага імпарту.

На карысць версіі аб "усходнім" (дняпроўскім) шляху пранікнення эмісій Рымскай імперыі ў Полацка-Віцебскае Падзвінне сведчыць заўважаная ўкраінскім даследчыкам Г. Бейдзіным перавага малаазійскіх эмісій сярод знаходак рымскіх правінцыяльных манет ва ўсходняй (левабярэжнай) частцы чарняхоўскай культуры [12, 2012, с. 151].

Цікавай з'яўляецца гіпотэза аб існаванні ў IV ст. яшчэ аднаго ўсходняга, так званага "футравага", або Балта-Волжскага шляху. На думку выдатнага расійскага даследчыка М. Б. Шчукіна, адным з участкаў "футравага" шляху магло быць Падзвінне [26, 2005, с. 209].

У той жа час нельга выключаць і магчымасць значна пазнейшага выпадзення рымскіх срэбраных манет у культурны слой гарадзішча і селішча Кардон – разам з арабскімі дзірхамамі. Перыяд актыўнага функцыянавання археалагічнага комплексу Кардон – рубеж VIII/IX – сярэдзіна X ст. – характарызуецца, верагодна, выкарыстаннем срэбраных манет у гандлёвых адносінах у першую чаргу на вагу, а не на лік. Таму нават у сярэднявеччы рымскія дэнарыі, як і кавалкі ўпрыгажэнняў, маглі быць плацёжным сродкам або сродкам накаплення. Выпадкі прысутнасці рымскага срэбра ў складзе скарбаў куфічных манет на Беларусі пакуль не зафіксаваны, але вядомы ў сумежных рэгіёнах. Так, у Польшчы рымскія манеты (пераважна срэбраныя) маюцца ў складзе больш чым 50 скарбаў X–XI стст. [27, 2007]. Манета Гардзіяна III знаходзілася ў скарбе пачатку XII ст. з в. Шпанькова Гатчынскага раёна Ленінградскай вобласці [19, 1961, с. 45, п. 174]. А ў Ровенскай і Кіеўскай абласцях Украіны былі знойдзены скарбы манет XVI і XVII стст., сярод якіх меліся дэнарыі Рымскай імперыі [19, 1961, с. 58, 74, п. 455, 866].

**Высновы.** Такім чынам, найбольш прымальнай для аўтараў артыкула з'яўляецца версія аб пранікненні рымскіх срэбраных манет на археалагічны комплекс Кардон у другой чвэрці I тыс. н.э. разам з насельніцтвам кіеўскай культуры. Пацвердзіць гэта здолеюць далейшыя даследаванні, якія, несумненна, прынясуць яшчэ шмат цікавых нумізматычных здабыткаў.

## Скарачэнні

RIC III – Mattingly, H. The Roman Imperial Coinage. Vol. III. Antoninus Pius to Commodus / H. Mattingly, E. A. Sydenham. – London: Spink and Son, Limited, 1930. – 545 p.

RIC IV – Mattingly, H. The Roman Imperial Coinage. Vol. IV, Part II. Macrinus to Pupienus / H. Mattingly, E. A. Sydenham, C. H. V. Sutherland. – London: Spink and Son, Limited, 1938. – 215 p.

RPC II – Burnett, A. M. Roman Provincial Coinage. Vol. II. From Vespasian to Domitian (AD 69–96) / A. M. Burnett, M. Amandry, I. Carradice. – London: British Museum Press, and Paris: Bibliothèque nationale de France, 1999. – 568 p.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Kietlińska, A. Monety starożytne w zbiorach Państwowego Muzeum Archeologicznego w Warszawie / A. Kietlińska // Materiały Starożytne. – Warszawa, 1957.– T. II. – S. 269–291.
2. Antoniewicz, W. Notatki archeologiczne / W. Antoniewicz // Wiadomośći numizmatyczno-archeologiczne. – Kraków, 1931. – T. XIII. – Rocznik, 1930. – S. 86–93.
3. Gupieniec, A. Przewodnik po dziale numizmatycznym muzeum archeologicznego w Łodzi. / A. Gupieniec. – Łódz: Wydawnictwo Muzeum Archeologicznego, 1954. – 147 s.: ill.
4. Побаль, Л. Антычныя нумізматычныя багацці Міншчыны і Віцебшчыны / Л. Побаль // Беларус. гіст. часоп. – 1996. – № 1. – С. 115–125.
5. Сидорович, В. Находки римских монет середины III–IV вв. на территории Беларуси / В. Сидорович // Numizmatika. Časopis slovenskej numizmatickej spoločnosti. – 2008а. – № 22. – S. 8–13.
6. Сидорович, В. Случайные находки античных монет на территории Беларуси в 1970-е–2007 гг. / В. Сидорович // Случайные находки: хронология, атрибуция, историко-культурный контекст: материалы тематической науч. конф. (Санкт-Петербург, 16–19 декабря 2008 г.). – СПб., 2008б. – С. 172–176.
7. Sidarovich, V. The Finds of Greek and Roman Provincial coins in Belarus / V. Sidarovich // Notae Numismaticae-Zapiski Numizmatyczne. – Kraków, 2014. – Tom IX. – S. 71–94.
8. Романов, Е. Археологическія находки / Е. Романов // Могилевская старина: сб. ст. Могилевских Губернских Ведомостей / под ред. Е. Р. Романова. – Могилёв: Тип. Губернского правления, 1900. – Вып. 1. 1898 и 1899 гг. – С. 5–6.
9. Поболь, Л. Д. Археологические памятники Белоруссии. Железный век / Л. Д. Поболь. – Минск: Наука и техника, 1983. – 456 с., ил.
10. Bodzek, J. Drachma Cezarei kapadockiej ze skarbu denarów Nietulisko Małe I / J. Bodzek // Studia z dziejów antyku. Pamięci Andrzeja Kunisza / Red.W. Kaczanowicz. – Katowice: Wydawnictwo Uniwersytetu Śląskiego, 2004. – S. 142–152.
11. Bursche, A. Roman coinage from Jakuszowice settlement in north Malopolska / A. Bursche // Notae Numismaticae-Zapiski Numizmatyczne. – Kraków, 1997. – Tom II. – P. 119–157.
12. Бейдин, Г. В. Римские провинциальные монеты на территории Украины в ареале черняховской культуры / Г. В. Бейдин // Древности. Харьковский историко-археологический ежегодник. – Харьков, 2012. – Вып. 11. – С. 147–159.

13. Kunisz, A. Drachmy licyjskie i pontyjskie w obiegu monetarnym na europejskich obszarach Cesarstwa Rzymskiego / A. Kunisz // Historia i Współczesność. – 1979. – T. 5. – S. 65–93.

14. Мызгин, К. В. Находки римских монет провинциальной малоазийской чеканки II–III вв. на территории черняховской культуры / К. В. Мызгин // Древнее Причерноморье. – Одесса, 2011. – Вып. IX. – С. 321–328.

15. Медведев, А. М. Беларуское Понеманье в раннем железном веке (I тыс. до н.э.–5 в. н.э.) / А. М. Медведев. – Минск: Б.и., 1996. – 200 с.; ил.

16. Михельбертас, М. М. Римский импорт в Литве: автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.06 / М. М. Михельбертас; Акад. наук Литовской ССР, Ин-т истории. – Вильнюс,1965. – 29 с.

17. Kaczanowicz, W. Moneta Allektusa znaleziona w Kownie / W. Kaczanowicz // Korpus znalezisk rzymskich z europejskiego Barbaricum – Warszawa, 2001. – Suplement. – Tom 2: Nowe znaleziska importow rzymskich z ziem polski II. – S. 137–140.

18. Bursche, A. Moneta i kruszec w kulturze wielbarskiej w okresie późnorzymskim. / A. Bursche // Przegląd Archeologiczny. – 1983. – 31. – S. 47–90.

19. Кропоткин, В. В. Клады римских монет на территории СССР / В. В. Кропоткин // Свод археологических источников; под общ. ред. акад. Б. А. Рыбакова. – Вып. Г4–4. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1961. – 135 с.

20. Михельбертас, М. М. Два клада римских провинциальных монет из Западной Литвы / М. М. Михельбертас // Нумизматика и эпиграфика. – М., 1968. – Том VII. – С. 68–71.

21. Михельбертас, М. М. Дополнительные сведения о кладе римских монет из Даргелишке (р-н Тельшяй, Литва) // М. М. Михельбертас // Pieniądz – Symbol – Władza – Wojna. Wspólne dziedzictwo Europy. Studia i Materiały. Białoruś-Estonia-Litwa-Łotwa-Polska-Rosja-Rumunia-Słowacja-Ukraina; pod red. K. Filipowa, B. Kuklik. – Augustów-Warszawa, 2010. – S. 53–59.

22. Мызгин, К. В. Некоторые аспекты политической и экономической истории населения Днепро-Донецкой лесостепи во второй четверти I тыс. н. э. по нумизматическим данным / К. В. Мызгин // Germania – Sarmatia. Древности Центральной и Восточной Европы эпохи римского влияния и переселения народов: сб. материалов. – Калининград: Янтарный сказ, 2008. – С. 68–87.

23. Левко, О. Н. Культурные трансформации в I тысячелетии н.э. на территории Витебского Подвинья и восточной части Днепро-Двинского междуречья / О. Н. Левко // Славяне на территории Беларуси в догосударственный период: к 90-летию со дня рождения Леонида Давыдовича Поболя: в 2 кн. / О. Н. Левко [и др.]; науч. ред.: О. Н. Левко, В. Г. Белявец; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Кн. 2. – Минск: Беларус. навука, 2016. – С. 271–320.

24. Шадыра, В. I. Матэрыяльная культура археалагічнага комплексу на возеры Сялява ў Дняпроўска-Дзвінскім міжрэччы: I–VIII стст. н.э. / В. I. Шадыра // Славяне на территории Беларуси в догосударственный период: к 90-летию со дня рождения Леонида Давыдовича Поболя: в 2 кн. / О. Н. Левко [и др.]; науч. ред.: О. Н. Левко, В. Г. Белявец; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Кн. 2. – Минск: Беларус. навука, 2016. – С. 197–255.

25. Кенько, П. М. Материалы верхнеднепровского варианта киевской культуры с селища Черная Лоза / П. М. Кенько // Славяне на территории Беларуси в догосударственный период: к 90-летию со дня рождения Леонида Давыдовича Поболя: в 2 кн. / О. Н. Левко [и др.]; науч. ред.: О. Н. Левко, В. Г. Белявец; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Кн. 2. – Минск: Беларус. навука, 2016. – С. 255–262.

26. Щукин, М. Б. Готский путь. Готы, Рим и черняховская культура / М. Б. Щукин. – СПб.: Филоло. фак. СПбГУ, 2005. – 576 с.

27. Zapolska, A. Denary rzymskie znajdowane w kontekstach wczesnośredniowiecznych na ziemiach polskich / A. Zapolska // Wiadomości Numizmatyczne. – Warszawa, 2007. – Rok LI, 2007. – Zeszyt 2 (184). – S. 149–178.

## References

1. Kietlińska A., “Monety starożytne w zbiorach Państwowego Muzeum Archeologicznego w Warszawie”, *Materiały Starożytne*, Warszawa, PL, 1957, vol. II, pp. 269–291.

2. Antoniewicz W., “Notatki archeologiczne”, *Wiadomośći numizmatyczno-archeologiczne*, Kraków, PL, 1931, vol. XIII, Rocznik, 1930, pp. 86–93.

3. Gupieniec A., *Przewodnik po dziale numizmatycznym muzeum archeologicznego w Łodzi*, Wydawnictwo Muzeum Archeologicznego, Łódz, PL, 1954.

4. Pobal’ L., “Antique numismatic wealth of Minsk region and Vitebsk region”, *Belaruski gistarychny chasopis* [Belarusian Historical Journal], 1996, no. 1, pp. 115–125.

5. Sidorovich V., “Finds of Roman coins of the middle 3–4 centuries on the territory of Belarus”, *Numizmatika. Časopis slovenskej numizmatickej spoločnosti*, 2008, no. 22, pp. 8–13.

6. Sidorovich V., “Random finds of antique coins on the territory of Belarus in the 1970s-2007”, *Sluchainye nakhodki: khronologiia, atributsiia, istoriko-kul’turnyi kontekst: materialy tematicheskoi nauchnoi konferentsii (Sankt-Peterburg, 16–19 dekabria 2008 g.)* [Random finds: chronology, attribution, historical and cultural context: materials of a thematic scientific conference (St. Petersburg, December 16–19, 2008)], St. Petersburg, RU, 2008, pp. 172–176.

7. Sidarovich V., “The Finds of Greek and Roman Provincial coins in Belarus”, *Notae Numismaticae-Zapiski Numizmatyczne*, Kraków, PL, 2014, vol. IX, pp. 71–94.

8. Romanov E., “Archaeological finds”, in Romanov E. R. (ed.), *Mogilevskaia starina: sbornik statei Mogilevskikh Gubernskikh Vedomostei, Vypusk 1. 1898 i 1899 gg.* [Mogilev antiquity: a collection of articles of the Mogilev Provincial Gazette, Issue 1. 1898 and 1899.], Tipografiia Gubernskogo pravleniia, Mogilev, BY, pp. 5–6.

9. Pobol’ L. D., *Arkheologicheskie pamiatniki Belorussii. Zheleznyi vek* [Archaeological monuments of Belarus. The Iron Age], Nauka I tekhnika, Minsk, BY, 1983.

10. Bodzek J., “Drachma Cezarei kapadockiej ze skarbu denarów Nietulisko Małe I”, in Kaczanowicz W. (ed.), *Studia z dziejów antyku. Pamięci Andrzeja Kunisza*, Wydawnictwo Uniwersytetu Śląskiego, Katowice, PL, 2004, pp. 142–152.

11. Bursche A., “Roman coinage from Jakuszowice settlement in north Malopolska”, *Notae Numismaticae-Zapiski Numizmatyczne*, Kraków, PL, 1997, vol. II, pp. 119–157.

12. Beidin G. V., "Roman provincial coins on the territory of Ukraine in the area of Chernyakhov culture", *Drevnosti. Khar'kovskii istoriko-arkheologicheskii ezhegodnik* [Antiquities. Kharkov Historical and Archaeological Yearbook], Kharkov, UA, 2012, Issue 11, pp. 147–159.

13. Kunisz A., "Drachmy licyjskie i pontyjskie w obiegu monetarnym na europejskich obszarach Cesarstwa Rzymskiego", *Historia i Współczesność*, 1979, vol. 5, pp. 65–93.

14. Myzgin K. V., "Finds of Roman coins of provincial Asia Minor coinage of the 2nd – 3nd centuries on the territory of Chernyakhov culture", *Drevnee Prichernomor'e* [Ancient Black Sea Coast], Odessa, UA, 2011, Issue IX, pp. 321–328.

15. Medvedev A. M., *Belorusskoe Poneman'e v rannem zheleznom veke (I tys. do n.e.–5 v. n.e.)* [Belarusian Ponemane in the Early Iron Age (I millennium BC – 5th century AD)], Minsk, BY, 1996.

16. Mikhel'bertas M. M., "Roman import in Lithuania", Abstract of Ph.D. dissertation, archeology, Academy of Sciences of the Lithuanian SSR, Institute of History, Vilnius, LT, 1965.

17. Kaczanowicz W., "Moneta Allektusa znaleziona w Kownie", *Korpus znalezisk rzymskich z europejskiego Barbaricum*, Warszawa, PL, 2001, Suplement, vol. 2: Nowe znaleziska importow rzymskich z ziem polski II, pp. 137–140.

18. Bursche A., "Moneta i kruszec w kulturze wielbarskiej w okresie późnorzymskim", *Przegląd Archeologiczny*, 1983, vol. 31, pp. 47–90.

19. Kropotkin V. V., *Klady rimskikh monet na territorii SSSR* [Treasures of Roman coins in the territory of the USSR], in Rybakov B. A. (ed.), Ser. Svod arkheologicheskikh istochnikov [Archaeological Sources], vol. G4–4, Izdatel'stvo Akademii nauk SSSR, Moscow, RU, 1961.

20. Mikhel'bertas M. M., "Two treasures of Roman provincial coins from Western Lithuania", Numizmatika i epigrafika [Numismatics and epigraphy], Moscow, RU, 1968, vol. 7, pp. 68–71.

21. Mikhel'bertas M. M., "Additional information on the treasure of Roman coins from Dargelishke (Telsiai, Lithuania)", *Pieniądz – Symbol – Władza – Wojna. Wspólne dziedzictwo Europy. Studia i Materiały. Białoruś–Estonia–Litwa–Łotwa–Polska–Rosja–Rumunia–Słowacja–Ukraina*, in Filipow K., Kuklik B. (ed.), Augustów-Warszawa, PL, 2010, pp. 53–59.

22. Myzgin K. V., "Some aspects of the political and economic history of the population of the Dnieper-Donetsk forest-steppe in the second quarter of the 1st millennium BC. e. by numismatic data", *Germania – Sarmatia. Drevnosti Tsentral'noi i Vostochnoi Evropy epokhi rimskogo vliianiia i pereseleniia narodov: sb. Materialov* [Germania–Sarmatia. Antiquities of Central and Eastern Europe of the era of Roman influence and the migration of peoples: a collection of materials], Iantarnyi skaz, Kaliningrad, RU, 2008, pp. 68–87.

23. Levko O. N., "Cultural transformations in the first millennium AD on the territory of the Vitebsk Dvina Coast and the eastern part of the Dnieper-Dvinsky interfluve", in Levko O. N., Marzaliuk I. A., Drobushevskii A. I., Dubitskaia N. N., Pobol' L. D., Kharitonovich Z. A., Il'iutik A. V., Belevets V. G., Belitskaia A. N., Kolosovskii Iu. V., Vergei V. S., Kasiuk E. F., Egoreichenko A. A., Ken'ko P. M., Dernovich S. D., Voitekhovich A. V., Shadyro V. I., Podgurskii P. N., Zaikovskii E. M., Kovalenia A. A., Danilovich V. V., Duk D. V., Lakiza V. L., Makushnikov O. A., Rassadin S. E., Rier Ia. G., *Slaviane na territorii Belarusi v dogosudarstvennyi period: k 90-letiiu so dnia rozhdeniia LeonidaDavydovicha Pobolia: v 2 kn.* [Slavs on the territory of Belarus in the pre-state period: to the 90th anniversary of the birth of Leonid Davydovich Pobol: in 2 books], in Levko O. N., Belevets V. G. (ed.), book 2, Belaruskaia navuka, Minsk, BY, 2016, pp. 271–320.

24. Shadyra V. I., "The material culture of the archaeological complex on Lake Selyava in the Dnieper-Dvina interfluve: I–VIII centuries. BC", in Levko O. N., Marzaliuk I. A., Drobushevskii A. I., Dubitskaia N. N., Pobol' L. D., Kharitonovich Z. A., Il'iutik A. V., Belevets V. G., Belitskaia A. N., Kolosovskii Iu. V., Vergei V. S., Kasiuk E. F., Egoreichenko A. A., Ken'ko P. M., Dernovich S. D., Voitekhovich A. V., Shadyro V. I., Podgurskii P. N., Zaikovskii E. M., Kovalenia A. A., Danilovich V. V., Duk D. V., Lakiza V. L., Makushnikov O. A., Rassadin S. E., Rier Ia. G., *Slaviane na territorii Belarusi v dogosudarstvennyi period: k 90-letiiu so dnia rozhdeniia Leonida Davydovicha Pobolia: v 2 kn.* [Slavs on the territory of Belarus in the pre-state period: to the 90th anniversary of the birth of Leonid Davydovich Pobol: in 2 books], in Levko O. N., Belevets V. G. (ed.), book 2, Belaruskaia navuka, Minsk, BY, 2016, pp. 197–255.

25. Ken'ko P. M., "Materials of the Upper Dnieper variant of the Kiev culture from the village of Black vine Osier", in Levko O. N., Marzaliuk I. A., Drobushevskii A. I., Dubitskaia N. N., Pobol' L. D., Kharitonovich Z. A., Il'iutik A. V., Belevets V. G., Belitskaia A. N., Kolosovskii Iu. V., Vergei V. S., Kasiuk E. F., Egoreichenko A. A., Ken'ko P. M., Dernovich S. D., Voitekhovich A. V., Shadyro V. I., Podgurskii P. N., Zaikovskii E. M., Kovalenia A. A., Danilovich V. V., Duk D. V., Lakiza V. L., Makushnikov O. A., Rassadin S. E., Rier Ia. G., *Slaviane na territorii Belarusi v dogosudarstvennyi period: k 90-letiiu so dnia rozhdeniia Leonida Davydovicha Pobolia: v 2 kn.* [Slavs on the territory of Belarus in the pre-state period: to the 90th anniversary of the birth of Leonid Davydovich Pobol: in 2 books], in Levko O. N., Belevets V. G. (ed.), book 2, Belaruskaia navuka, Minsk, BY, 2016, pp. 255–262.

26. Shchukin M. B., *Gotskii put'. Goty, Rim i cherniakhovskaia kul'tura* [The Gothic Way. Goths, Rome and Chernyakhiv culture], Filologicheskii fakul'tet SPbGU, St. Petersburg, RU, 2005.

27. Zapolska A., "Denary rzymskie znajdowane w kontekstach wczesnośredniowiecznych na ziemiach polskich", *Wiadomości Numizmatyczne*, Warszawa, PL, 2007, Rok LI, 2007, Zeszyt 2 (184), pp. 149–178.

## Информация об авторах

**Левко Ольга Николаевна** – доктор исторических наук, профессор, заведующая центром археологии и древней истории Беларуси. Институт истории НАН Беларуси (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: onlevko@gmail.com

**Сидорович Виталий Михайлович** – заведующий учебной лабораторией. Белорусский государственный университет, исторический факультет (ул. Красноармейская, 6, 220030, Минск, Республика Беларусь). E-mail: wital.sidarowicz@gmail.com

## Information about the authors

**Volga M. Liauko** – D. Sc. (Hist.), Professor, Head of the Center for Archeology and Ancient History of Belarus, Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus (1 Akademicheskaya Str., Minsk 220072, Belarus). E-mail: onlevko@gmail.com

**Vitaly M. Sidarovich** – Head of Training Laboratory, History Department, Belarusian State University (6 Krasnoarmeyskaya Str., Minsk 220030, Belarus). E-mail: wital.sidarowicz@gmail.com